Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"

# Сучасныя праблемы гістарыяграфіі гісторыі

Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі 28 лістапада 2003 года

У 3-х частках

Частка 2

Мінск
2003

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 94(476)(043.2)
ББК 63.3(4 БеИ)
Г 51

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ імя М. Танка

Рэдакцыйная калегія: У.В. Тугай (галоўны рэдактар), С.П. Барадзін, Дз.У. Дубінін, А.П. Жытко, У.У Куніцкі, А.І. Малюгін, А.М. Люты, А.Ф. Рацько, В.М. Фамін, А.А. Цобкало, Л.Л. Шкуцько

Рэцэнзенты: У.М. Міхнюк, доктар гістарычных навук, прафесар
А.А. Яноўскі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Г 51 Сучасныя праблемы гістарыяграфіі гісторыі: Матэрыялы Рэсп. навук.-практ. Канф., 28 лістапада 2003 г.; Рэдкал.: У.В. Тугай (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БДПУ, 2003.-с. 276.

Асвятляюцца актуальныя пытанні гістарыяграфіі гісторыі Беларусі ад старажытнасці да нашых дзен, гістарыяграфія гісторыі славянскіх народаў а таксама гістарыяграфія ўсеагульнай гісторыі. Прызначаецца навукоўцам і выкладчыкам вышэйшых навучальных устаноў.

**УДК 94(476)(043.2)**
**ББК 63.3(4 БеИ)**

ISBN 985-435-155-6 (ч. 2)

© БДПУ імя М. Танка, 2003

XVIII – першай палове XIX ст. (Сацыяльны аспект) // Нацыянальная палітыка расійскага самадзяржаўя на Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзяў. – Мн.: БДПУ імя М. Танка, 1995. – С. 128–151 і інш.
22. Пичета В.И. Класавыя супярэчнасці ў Беларусі напярэдадні рэвалюцыі // Беларусь: Нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху. – Мн., 1924; Пичета В.И. Крестьянское и рабочее движение в Белоруссии в эпоху 1905 года. – Мн., 1926.; Довнар-Запольский М. В. Народное хозяйство Белоруссии в 1861-1914 гг. – Мн., 1926.; Кернажыцкі К.І. Да гісторыі аграрнага руху на Беларусі перад імперыялістычнай вайной. – Мн., 1932.; Шабуня К.И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905-1907 гг. – Мн.: Наука и техника, 1962; Шабуня К.И. О развитии капитализма в помещичьем хозяйстве Белоруссии в конце XIX и начале XX в. // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы, 1961 г. – Рига, 1963. – С. 435–447; Кожушков А.И. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии во второй половине XIX века. – Мн., 1963; Экономика Белоруссии в эпоху империализма / Под ред. Г.Т. Ковалевского – Мн.: Изд-во АН БССР, 1963; Липинский Л. Г. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (вторая половина XIX в.). – Мн.: Наука и техника, 1971; Липинский Л. Г. Столыпинская аграрная реформа в Белоруссии. – Мн.: Изд-во БГУ, 1978; Бейлькин Х.Ю. Сельскохозяйственный рынок Белоруссии, 1861–1914 гг. – Мн.: Наука и техника, 1989.
23. Панюціч В.П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861-1900 гг. – Мн.: Наука и техника, 1990; Панюціч В.П. Пазямельныя арэндныя адносіны на Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 4. – С. 40-50; Панюціч В.П. Наемный труд в сельском хозяйстве Беларуси 1861-1914 гг. – Мн.: Навука і тэхніка, 1996 і інш.

## ГІСТАРЫЯГРАФІЯ 90-ЫХ ГАДОЎ XX СТ. ПА ПРАБЛЕМЕ "ЯЎРЭІ Ў САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫМ ЖЫЦЦІ БЕЛАРУСІ Ў АПОШНЯЙ ЧВЭРЦІ XVIII – XIX СТ."

Л.Л. Шкуцько
г. Мінск

Найбольш актыўна працэс вывучэння гісторыі яўрэяў, іх ролі ў сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці Беларусі пачаўся ў пачатку 90-ых гадоў XX ст., калі Рэспубліка набыла дзяржаўны суверэнітэт. Адным з



першых падцвярджэнняў гэтаму стала навуковая канферэнцыя "Актуальныя праблемы гісторыі і культуры яўрэйскай дыяспары ў Беларусі", праведзеная ў 1992 г. Паведамленні вядомых беларускіх навукоўцаў А. Грыцкевіча, Э. Іофэ і інш. паказалі, што ў рэспубліцы з'яўляюцца даволі цікавыя падыходы да вывучэння праблемы. Асабліва важнай, на мой погляд, была міжнародная навуковая канферэнцыя "Яўрэйская культура Беларусі і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі", прайшоўшая ў 1994 г. у Мінску. Зборнік матэрыялаў канферэнцыі "Беларусіка" кн. 4, паказаў наколькі сур'езна адносіцца навуковая грамадскасць нашай рэспублікі і краін замежжа да пытанняў вывучэння гісторыі яўрэяў Беларусі на розных этапах яе гісторыі. І гэта невыпадкова – уклад яўрэяў у развіцце эканомікі, культуры беларускіх земляў даволі значны.

У спісе навуковых артыкулаў, асобных прац, прысвечаных гісторыі яўрэяў, значнае месца займаюць даследаванні, у якіх адлюстроўваюцца неадназначныя працэсы апошняй чвэрці XVIII – XIX ст.

У 1996 г. у Мінску выйшаў навукова-папулярны нарыс прафесара Э. Іофэ "Страницы истории евреев Беларуси". Па сутнасці гэта першая абагульняючая праца па гісторыі яўрэяў Беларусі, хаця па словах самаго аўтара, ен не прэтэндаваў на поўнае асвятленне падзей, а імкнуўся высветліць найбольш важныя моманты многавекавой гісторыі беларускага яўрэйства. Перыяд апошняй чвэрці XVIII – XIX ст. асвятляецца ў раздзеле "В сени двухглавого орла". Тут адлюстроўваюцца палітыка самаўладдзя адносна яўрэяў, іх удзел у эканамічным, культурным жыцці. Цікавасць выклікаюць дадаткі: "Важнейшие даты по истории евреев Беларуси" і "Они родились на белорусской земле".

У 1997 г. быў выдадзены першы нумар зборніка «Евреи Беларуси. История и культура», у якім друкуецца шмат матэрыялаў, прысвечаных гісторыі і культуры яўрэйскага народа, у тым ліку і па праблеме. У № 1 зборніка за 1997 г. змешчаны даволі аб'емны і падрабязны бібліяграфічны спіс літаратуры па яўрэйскаму пытанню, выдадзенай з 1990 па 1997 г.

Значны ўклад у распрацоўку праблемы ўнес Я. Анішчанка [1]. Яго навуковыя працы прысвечаны становішчу беларускіх яўрэяў у працэсе фарміравання мяжы аселасці, урадавай палітыцы адносна іх. У сваіх даследаваннях аўтар на выснове, у большасці малавядомых архіўных матэрыялаў, адлюстроўвае, таксама сацыяльнае, дэмаграфічнае і эканамічнае становішча яўрэяў у канцы XVIII – XIX ст.

Дадзеныя аб колькасным складзе яўрэяў па некаторым гарадам, іх удзеле ў развіцці прамысловасці, гандлю, раместваў і г.д. маюцца ў шматлікіх працах, у тым ліку і манаграфіі "Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX вв." прафесара А. Лютага [2].



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

У шэрагу артыкулаў Л. Шкуцько [3] на выснове архіўных матэрыялаў, тагачасных дакументаў, аналізу прац вядомых яўрэйскіх даследчыкаў Ю Гессена, С. Дубнова, М. Кулішэра і інш. адлюстроўваецца палітыка царскага ўрада адносна яўрэяў у розныя гады, дэмаграфічныя працэсы, удзел яўрэяў у эканамічным жыцці, іх сацыяльнае і матэрыяльнае становішча, дзейнасць кагалаў, арганізацыя традыцыйнай і школьнай адукацыі, дабрачыннасці і г.д.

У 1999 г. у Мінску выйшла праца Ю. Функ "Евреи Беларуси в конце XIX – начале XX ст.". У ей, зыходзясы з архіўных матэрыялаў, аналізу дзяржаўнай заканадаўчай базы, адлюстроўваецца сацыяльна-эканамічнае становішча яўрэяў, іх традыцыйны ўклад жыцця, роля адукацыі, дзейнасць кагалаў, арганізацыя дабрачыннай справы і г.д.

Цікавымі як у навуковым, так і пазнавальным сэнсе з'яўляюцца таксама працы І. Герасімавай, М. Гайбы, С. Кузняевай, К. Шыдлоўскага аб ролі яўрэйскіх абшчын у адносінах з мясцовымі ўладамі і насельніцтвам, у арганізацыі грамадскага і эканамічнага жыцця яўрэяў [4].

Шэраг даследаванняў прысвечана непасрэдна розным аспектам сацыяльна-эканамічнага жыцця яўрэяў. Так, С. Ходзін і У. Сосна ў сваім артыкуле "Яўрэі і земляробства ў Беларусі" [5] адлюстроўваюць намаганні ўлад прымацаваць яўрэяў да зямлі, зрабіць іх сялянамі, спробу ўтварэння земляробчых калоній, прычыны няўдач у гэтай справе. І. Клімовіч у артыкуле "Налоговое положение еврейского населения городов Беларуси в конце XVIII – первой половине XIX в." [6] раскрывае падатковую палітыку адносна яўрэяў, зазначаючы, што яны ўжо з першага падзелу Рэчы Паспалітай былі выдзелены ў асобную падатковую адзінку і абкладаліся падушным падаткамі, выплочваючы земскі падатак, каробачны і свячны збор, падатак за пашыў і нашэнне яўрэйскага традыцыйнага адзення.

Пытанням яўрэйскага асветніцтва, культуры, адукацыі прысвяцілі некаторыя свае працы І. Герасімава, Э. Іофэ, В. Сабалеўская, В. Бацяеў [7] і інш.

Звесткі па праблеме маюцца таксама ў асобных працах замежных гісторыкаў С. Атамукаса, Г. Аграноўскага, Д. Кліера [8] і інш.

**Літаратура:**


1. Анішчанка Я. Яўрэі Усходняй Беларусі паводле ўрадавага ўліку ў канцы XVIII ст. // Весці АН Белурусі. Сер. грам. нав. 1993, № 4. С. 58-68; Анішчанка Я. Арганізацыя кагалаў на Беларусі падчас першага падзелу Рэчы Паспалітай // Беларускі гістарычны часопіс. 1995, № 6.





С. 13-24; Анішчанка Я. Падрыхтоўка да ўвядзення рысы аседласці ў Беларусі (1881-1793 гг.) // Весці АН Беларусі. Сер гум. нав. 1993, № 1. С. 62-70 і інш.

2. Лютый А. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII – п.п. XIX вв. Мн., 1987.
3. Шкуцько Л. Яўрэі Мінскай губерні ў канцы XVIII – XIX ст. Нацыянальная палітыка расійскага самадзяржаўя на Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. Мн., 1995. С. 155-180.; Шкуцько Л. Палітыка царызму ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва на Беларусі пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай. Гісторыя матэрыяльнай і духоўнай культуры нацыянальнасцей Беларусі ў другой палове XVIII – п.п. XIX ст. Мн., 1996. С. 64-84; Шкуцько Л. Яўрэі Магілеўскай губерні ў апошняй чвэрці XVIII – XIX ст. // Евреи Беларуси. 1998, № 2 і г.д.
4. Герасімава І. З гісторыі яўрэйскай абшчыны г. Бабруйска (канец XVIII – пач. XIX). Гісторыя матэрыяльнай і духоўнай культуры нацыянальнасцей Беларусі ў др. пал. XVIII - п.п. XIX ст. Мн., 1996. С. 133-164; Гайба М. З гісторыі навагрудскай яўрэйскай абшчыны. Беларусіка. Кн. 4, Мн., 1995. С. 85-88; Кузняева С. Еврейские общины Белоруссии в конце XV - начале XX ст. Мн., 1998; Шыдлоўскі К. Парушаны дом. З гісторыі яўрэйскіх абшчын Браслаўшчыны . Мішпоха. Віцебск, 1995, № 1. С. 55-63.
5. Ходзін С., Сосна У. Яўрэі і земляробства ў Беларусі. Беларусіка. Кн. 4 Мн., 1995. С. 60-64.
6. Климович И. Налоговое положеие еврейского населения городов Беларуси в конце XVIII - п.п. XIX ст. Гістарычнае пазнанне – важнейшая ўмова фарміравання светапогляду настаўніка XXI ст. Матэр. рэсп. нав. тэр. канф. Мн., 2003. С. 116-117.
7. Герасімава І. Прадпасылкі і станаўленне хасідызму на Беларусі. Нацыянальная палітыка расійскага самадзяржаўя на Беларусі ў канцы XVIII – пач. XX ст. Мн., 1995. С. 180-194; Іофэ Э. Роля Вільні ў культурным жыццi беларускіх яўрэяў (XVIII – п.п. XX ст) // Весці міжнароднай акадэміі вывучэння нацыянальных меншасцей. Брэст, 1997. С. 32-35; Сабалеўская В. Да пытання аб хрысціянска-іудзейскіх стасунках на Беларусі ў XIX ст. // Нацыянальныя меншасці ў Беларусі і ў свеце. Брэст, 1997. С. 36-37; Бацяеў В. Святочна-абрадавая культура яўрэяў Беларусі ў XIV – XIX ст. Беларусіка. Кн. 4. С. 52-55 і інш.
8. Атамукас С. Евреи в Литве. XV – XX вв. Вильнюс, 1990; Аграновский Г. Становление еврейского книгопечатания в Литве. Москва – Иеруса-




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ